# *ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЛАД І ПРАВА НА БЕЛАРУСІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ*

# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| генерал-губернатарствы | | | | | | |
| Літоўскае | | | | Беларускае | | |
| | | | | | | |
| Губерні | | | | Губерні | | |
| Віленская | Гродзенская | Мінская | | Віцебская | Магілёўская | Смаленская |
| | | | | | | |
| Паветы | | | | | | |

# ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎЛАДА

- Выканаўчая ўлада ў губернях належала *генерал-губернатарам* і *губернатарам*, якія прызначаліся непасрэдна імператарам. На чале павятовай адміністрацыі знаходзіўся *павятовы начальнік*, якога прызначаў міністр унутраных спраў. У губернскіх гарадах ствараліся органы расійскага адміністрацыйнага кіравання: губернскія ўправы, казённыя палаты, прыказы і г.д. Уся сістэма дзяржаўнай улады была сфарміравана паводле вертыкальнага прынцыпу. Кіруючыя пасады займалі чыноўнікі, прысланыя з расійскіх губерняў. Аднак пры гэтым другарадныя пасады ў губернскай і павятовай адміністрацыі займалі пераважна прадстаўнікі мясцовай шляхты.

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАСАДЫ

| | |
|---|---|
| **генерал-губернатар** | **лічыўся намеснікам цара і ўзначальваў мясцовую адміністрацыю падпарадкаваных яму тэрыторый. У час знахоОджання ў Санкт-Пецярбургу ён засядаў у Сенаце, у тым дэпартаменце, да якога адносіліся справы яго губерні. Фактычна генерал-губернатар быў надзелены неабмежаванымі паўнамоцтвамі. Яму падпарадкоўваліся вайсковыя і грамадзянскія губернатары (або правіцелі)** |
| губернатар | У абавязак грамадзянскага губернатара, які камандаваў мясцовым гарнізонам, уваходзіў нагляд за зборамі падаткаў, рэкрутаў, ходам следства, заключэннем казённых падрадаў і паставак, падтрыманнем грамадскага парадку і інш. Персанальны склад вышэйшай адміністрацыі набіраўся з рускіх саноўнікаў і чыноўнікаў. Аднак канчатковае рашэнне прымаў генерал-губернатар, таму ўлада грамадзянскіх губернатараў у канцы XVIII—першай палове XIX ст. была даволі абмежаванай. Да таго ж адбываліся іх частыя персанальныя змены |
| губернскае праўленне | ў складзе «общего присутствия» і канцылярыі. Гаспадарчай і фінансавай справай кіравала казённая палата, якую ўзначальваў віцэ-губернатар. Яна займалася раскладам і зборам падаткаў, кіраваннем і наглядам за казённай маёмасцю. У губернях дзейнічалі і такія органы кіравання, як рэкруцкія ўправы, прыказ грамадскай апекі, межавыя канторы і інш. |

# “ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА РАСІЙСКАМУ ДВАРАНСТВУ”

- На тэрыторыю Беларусі была распаўсюджана дзейнасць “Даравальнай граматы расійскаму дваранству” 1785 г. Паводле яе, стваралiся органы дваранскага самакiравання – губернскiя i павятовыя дваранскiя сходы на чале з выбарнымi прадвадзiцелямi дваранства. Акрамя таго шляхта атрымлiвала права выбiраць членаў губернскiх i павятовых земскiх судоў, вызвалялася ад падаткаў. Разам з тым у параўнаннi з часамi Рэчы Паспалiтай шляхта страцiла ўплыў на працэсы дзяржаўна-палiтычнага кiравання:

- адменена дзейнасць сойму і соймікаў,
- забаронены правы на стварэнне канфедэрацыі, прыватных войскаў і ўмацаванняў.



# СУДОВАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСІ

- вышэйшымі судамі ў заходніх губернях былі *галоўныя суды,* падзеленыя на два дэпартаменты — крымінальных і грамадзянскіх спраў. Членамі і засядацелямі суда маглі быць толькі шляхціцы, якія выбіраліся на павятовых шляхецкіх сходах тэрмінам адпаведна на тры і адзін год. Галоўны суд, як правіла, выконваў свае функцыі ў якасьці апеляцыйнага суда па скаргах на пастановы замкавага (гродскага), земскага і падкаморскага судоў. Ён таксама разглядаў некаторыя справы па першай інстанцыі. Апеляцыі на рашэнні галоўных судоў падаваліся ў Сенат.

# МАРШАЛКАЎСКІ КАМІСАРСКІ МЕЖАВЫ СУД І ЗЕМСКІ ПАВЯТОВЫ СУД :

- У губернях Беларусі працягваў існаваць і так званы *маршалкаўскі камісарскі межавы суд:* рашэннем Галоўнага суда фарміравалася камісія для разгляду скаргаў на прыгаворы падкаморскага суда па зямельных спрэчках. Маршалкаўскі камісарскі суд складаўся з павятовага маршалка і некалькіх членаў, якія выбіраліся бакамі па ўзаемнай згодзе.
- Асноўным тыпова саслоўным шляхецкім судом першай інстанцыі заставаўся *земскі павятовы суд.* У яго ўваходзілі суддзя, два падсудкі і пісар, якія выбіраліся шляхтай на тры гады. У яго кампетэнцыі знаходзіліся ўсе крымінальныя справы, за выключэннем тых, якія ўваходзілі ў сферу дзейнасці Галоўнага і замкавага судоў. Земскі павятовы суд разглядаў і некаторыя грамадзянскія справы. Апеляцыі на ра-шэнні земскага шляхецкага суда падаваліся ў Галоўны суд на працягу шасці тыдняў.

| ПАДКАМОРСКІ СУД | ЗАМКАВЫЯ (ГРОДСКІЯ) СУДЫ. |
|---|---|
| Усе справы аб зямельных спрэчках знаходзіліся ў кампетэнцыі *падкаморскага суда.* Справы ў гэтым судзе разглядаў адзін суддзя-падкаморы непасрэдна на спрэчным мельным участку. Рашэнне прыводзілася ў выкананне праз азначэнне мяжы ўчастка. У дапамогу падкаморыю выбіраўся адзін каморнік (землямер), які ў выпадку адсутнасці падкаморыя сам разглядаў справу падкаморскага суда і выносіў рашэнне. Апеляцыі на рашэнні падкаморскага падаваліся ў Галоўны суд. | Іх членамі былі замкавы суддзя, падсудак і пісар. Усе яны зацвярджаліся на пасады генерал-губернатарам або губернатарам. Пасяджэнні замкавага суда праходзілі штомесячна на працягу двух тыдняў.<br>Замкавы суд разглядаў у асноўным крымінальныя справы. апеляцыі на рашэнні замкавага суда падаваліся ў Галоўны. Разам з судовай дзейнасцю замкавы суд выконваў і шэраг адміністрацыйных функцый. |

# ЗМЕНЫ Ў СУДОВАЙ СІСТЭМЕ ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ 1830-1831 ГГ.

- Пасля няўдалага паўстання 1830—1831 гг. на Беларусі пачалася ліквідацыя старой судовай сістэмы і яе уніфікацыя. **У** 1831 **г. замест галоўных судоў у губернях былі створаны палаты крымінальнага і грамадзянскага судоў, земскія і замкавыя суды ператвораны ў павятовыя, усё судаводства пераведзена на рускую мову.** Нагляд за дзейнасцю мясцовых судоў выконвалі генерал-губернатары і губернатары, якія мелі права адмяняць іх пастановы. Вышэйшай касацыйнай інстанцыяй для ўсіх судоў стаў Сенат.
- У 1830–1831 г. была адменена дзейнасць Статута ВКЛ 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях, а ў 1840 г. на ўсёй тэрыторыі былога ВКЛ. Замест яго ўводзілася расійскае заканадаўства.

# ЗВОД ЗАКОНАЎ РАСІЙСКАЙ ІМ

- У 1826 г. пад кіраўніцтвам М.М. Сперано па падрыхтоўцы Зводу законаў Расійска час было прынята рашэнне пачаць мясцовых законаў заходніх губерня ўключыць у агульны Звод законаў Рас падрыхтоўкай кіраваў вядомы беларус Даніловіч.


СВОДЪ
ЗАКОНОВЪ
РОССІЙСКОЙ ИМПЕРІИ,
ГОСУДАРЯ ИМПЕРАТОРА
НИКОЛАЯ ПАВЛОВИЧА
Уставы Казеннаго Управленія.

# У СТРУКТУРНЫХ АДНОСІНАХ ПРАЕКТ ЗВОДУ МЯСЦОВЫХ ЗАКОНАЎ РАСПАДАЎСЯ НА ТРЫ ЧАСТКІ

I. У першай разглядалася прававое становішча розных катэгорый насельніцтва (шляхты, духавенства, сялянства і мяшчанства).

II. Другая частка была прысвечана шлюбна-сямейнаму і грамадзянскамў праву. У галіне сямейнага права ўплыў мясцовых норм права найбольш бачны ў адносінах атрымання спадчыны, парадку і ўмоў заключэння шлюбаў паміж асобамі каталіцкай веры, а ў сферы грамадзянскага права — у адносінах да сервітутаў, некаторых інстытутаў абавязацельнага права.

III. Больш за ўсё ўплыў мясцовага права адчуваецца ў трэцяй частцы Зводу мясцовых законаў, дзе выкладзены судовы парадак і судаводства па пэўнай катэгорыі грамадзянскіх спраў. Былі спрошчаны правілы падсуднасці па грамадзянскіх справах, істотна адрозніваўся парадак іх разгляду на судовым пасяджэнні і выканання і абскарджання судовых рашэнняў.

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.

- Беларусь сярэдзіны XIX ст. уяўляла сабой аграрны рэгіён. эканамічнае становішча якога вызначала сельская гаспадарка. Асноўную масу насельніцтва (72,3 %) складалі сяляне.
- Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі за кошт памяншэння сялянскіх надзелаў пашыралі панскую ворную зямлю і пераводзілі сялян з аброку на паншчыну (у 50-я гг. на ёй было звыш 90 % сялян).
- На ўзмацненне эксплуатацыі беларускае сялянства адказвала супраціўленнем. Толькі ў перыяд 1858—1860 гг. на Беларусі адбылося больш за 40 сялянскіх выступленняў.

# КРЫЗІС ФЕАДАЛЬНА-ПРЫГОННІЦКАЙ ГАСПАДАРКІ

- стаў відавочны ў сярэдзіне 19 ст., вымусіў царскі ўрад шукаць шляхі да рэфармавання вытворчых адносін. Неабходнасць адмены прыгоннага права стала ўсведамляцца правячымі коламі пасля паражэння Расійскай імперыі ў Крымскай вайне 1853-1856 гг., якая паказала тэхнічную адсталасць Расіі ў параўнанні з індустрыялізаванымі заходнееўрапейскімі краінамі. Шляхам адмены прыгоннага права царызм спадзяваўся стварыць умовы для тэхнічнай мадэрнізацыі гаспадаркі імперыі.

# МАНІФЕСТ АБ АДМЕНЕ ПРЫГОННАГА ПРАВА

- 19 лютага 1861 г. расійскі імператар Аляксандр II падпісаў Маніфест аб адмене прыгоннага права і дапасаваныя да яго “Агульнае палажэнне”, “мясцовыя палажэнні” і дадатковыя правілы, якія ілюстравалі змест аграрнай





БОЖІЕЮ МИЛОСТІЮ
МЫ, АЛЕКСАНДРЪ ВТОРЫЙ,
ИМПЕРАТОРЪ И САМОДЕРЖЕЦЪ
ВСЕРОССІЙСКІЙ,

ЦАРЬ ПОЛЬСКІЙ, ВЕЛИКІЙ КНЯЗЬ ФИНЛЯНДСКІЙ,
и прочая, и прочая, и прочая.

Объявляемъ всѣмъ НАШИМЪ вѣрноподданнымъ.

Заканчивается манифест знаменитой фразой, памятной многим из нас еще со школьной скамьи:

Осѣни себя крестнымъ знаменіемъ, православный народъ, и призови съ НАМИ Божіе благословеніе на твой свободный трудъ, залогъ твоего домашняго благополучія и блага общественнаго.

Данъ въ Санктпетербургѣ, въ девятнадцатый день Февраля, въ лѣто отъ Рождества Христова тысяча восемьсотъ шестьдесятъ первое, Царствованія же НАШЕГО въ седьмое.

На подлинномъ Собственною ЕГО ИМПЕРАТОРСКАГО ВЕЛИЧЕСТВА рукою подписано:
АЛЕКСАНДРЪ.

Печатанъ въ Санктпетербургѣ при Святѣйшемъ Сунодѣ.

# СУТНАСЦЬ ПРАВОДЗІМАЙ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ ПАЛЯГАЛА Ў НАСТУПНЫМ:

- 1) Сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і грамадзянскія правы: яны маглі гандляваць, набываць рухомую і нерухомую маёмасць, паступаць у навучальныя ўстановы і на службу, несці асабістую адказнасць перад судом і г.д.; памешчыкі не маглі больш прадаваць і караць сялян.
- 2) Памешчыкі прызнаваліся ўласнікамі ўсёй зямлі, якая належала ім да рэформы. Частка гэтай зямлі адводзілася для надзялення сялян у пастаяннае карыстанне. На працягу дзевяці гадоў сяляне павінны былі выконваць за выдзеленыя ім надзелы павіннасці на карысць памешчыка (паншчына або чынш). На гэты перыяд яны лічыліся *часоваабавязанымі* і не маглі пакінуць сваё месца жыхарства без дазволу памешчыка.
- 3) Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся *ўстаўнымі граматамі*, складанне якіх даручалася памешчыкам і спецыяльна ўведзеным для гэтага чыноўнікам – міравым пасрэднікам у двухгадовы тэрмін.

- 4) Памеры надзелаў, якія адводзіліся сялянам, вызначаліся ў залежнасці ад мясцовых умоў.
- 5) Сяляне атрымлівалі права выкупу ва ўласнасць вызначаных для іх надзелаў са згоды памешчыка. Пасля ажыццяўлення выкупу часоваабавязаныя адносіны сялян спыняліся. *Выкупная сума была такога памеру, каб памешчык, паклаўшы яе ў банк (пад 6% гадавых), мог атрымліваць прыбытак, роўны штогадоваму чыншу з зямлі, якая перайшла ва ўласнасць селяніна. Аднак сяляне не мелі такой сумы грошай. Дзяржава выступіла ў якасці пасярэдніка паміж памешчыкамі і сялянамі. Пры выкупе надзелаў сяляне павінны былі заплаціць 20-25% ад выкупной сумы, а астатнюю частку атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер. У выніку гэтай аперацыі сяляне павінны былі на працягу 49 гадоў плаціць дзяржаве выкупныя плацяжы, якія ўключалі ў сябе доўг і працэнты за выдзеленую пазыку.*
- 6) Стваралася сістэма сялянскага самакіравання. Сяляне, якія пражывалі на пэўнай тэрыторыі і складалі сельскую абшчыну, на агульным сходзе выбіралі старасту, зборшчыка падаткаў і іншых службовых асоб. Некалькі сельскіх абшчын утваралі воласць. Валасны сход выбіраў валасную ўправу на чале са старшынёй і валасны суд. У сваёй дзейнасці яны падпарадкоўваліся дзяржаўнай павятовай адміністрацыі.



# У 1863-1864 ГГ. УРАД ПАЙШОЎ НА НЕКАТОРЫЯ САСТУПКІ СЯЛЯНАМ:



- - адмена часоваабавязанага становішча для сялян беларускіх губерняў у 1863-1864 гг. і перавод іх на абавязковы выкуп;
- - змяншэнне сумы выкупных плацяжоў па розных губернях ад 20% да 75%;
- - вяртанне сялянам часткі адрэзаных раней зямель; у выніку сярэднія памеры надзелаў былых памешчыцкіх сялян Беларусі аказаліся вышэйшымі, чым у цэлым па Расійскай імперыі (у Беларусі 4,2-5,7 дзесяціны, у Расійскай імперыі – 3,3 дзесяціны).

- *У 1863 г. былі створаны камісіі, якія павінны былі праверыць памеры сялянскіх надзелаў і скласці выкупныя акты. Складанне выкупных актаў на тэрыторыі Беларусі было завершана ў асноўным да пачатку 1870-х гг.*

# СУДОВАЯ РЭФОРМА

- *Развіццё капіталістычных адносін, адмена прыгоннага права выклікалі патрэбу ў змяненні ўсёй судовай сістэмы краіны, яе дэмакратызацыі. Судовая рэформа пачала праводзіцца ў жыццё ў 1864 г. Асноўныя палажэнні рэформы адлюстраваны ў чатырох заканадаўчых актах:*

- «Заснаванне судовых устаноў»,
- «Статут крымінальнага судаводства»,
- «Статут грамадзянскага судаводства»,
- «Статут аб пакараннях, якія накладваюць міравыя суддзі».

# ПАЛАЖЭННІ РЭФОРМЫ

- У аснову рэформы была пакладзена тэорыя падзелу ўлады. Абвешчана аддзяленне суда ад адміністрацыі, увядзенне агульнага ўсесаслоўнага суда, роўнасць усіх перад судом, нязменнасць суддзяў і следчых, выбарнасць міравых суддзяў і прысяжных засядацеляў, галоснасць, непасрэднасць і спаборнасць судовага працэса, права абвінавачанага на абарону. Важным вынікам рэформы стала заснаванне ***адвакатуры*** для абароны па крымінальных і прадстаўніцтва інтарэсаў старон па грамадзянскіх справах
- З мэтай нагляду за судамі, следствам і месцамі зняволення была рэарганізавана ***пракуратура***, якая змяняла напрамак сваёй дзейнасці. З органа кантролю за вытворчасцю спраў у сферы кіравання («око государства») яна ператваралася ў орган абвінаваўчай улады. *«Прокуратура есть постоянное судебно-административное учреждение, состоящее из лиц, назначенных от правительства н обязаных по долгу службы охранять законы и преследовать преступников во имя общественных интересов…»*

# СУДОВАЯ СІСТЭМА

- Згодна з законам стварапіся дзве судовыя сістэмы: мясцовыя і агульныя суды. **Да мясцовых належалі міравыя суды і з'езд іміравых суддзяў, да агульных — акруговыя суды і судовыя палаты (адна на некалькі губерняў).**

- *З'взд міравых суддзяў* быў судом другой інстанцыі и разглядаў апеляцыйныя скаргі на пастановы міравых суддзяў

- *Міравым судам* былі падсудныя грамадзянскія справы пры цане іска да 500 руб. і крымінальныя, па якіх прадугледжваліся арышт да трох месяцаў, грашовае спагнанне да 300 р. ці заключэнне ў работны дом (прымусовая праца на карысць грамадства) да аднаго года.

- *Акруговы суд,* як правіла, складаўся з грамадзянскага і крымінальнага аддзяленняў, а апошняе — з *кароннага суда і суда прысяжных засядацеляў.* Акруговым судам былі падсудныя ўсе крымінальныя справы за выключэннем палітычных і пэўных службовых злачынстваў.

- *Судовыя палаты* дзейнічалі як суды другой інстанцыі ў адносінах да акруговых судоў. Аднак крымінальныя справы, якія разглядаліся з удзелам прысяжных засядацеляў, апеляцыйнаму перагляду не падлягалі. Па некаторых крымінальных справах, напрыклад па палітычных, судовыя палаты маглі дзейнічаць як суд першай інстанцыі.

# СЕНАТ



- Вышэйшым органам судовага нагляду, касацыйным і вярхоўным судом у Расіі з'яўляўся правячы *Сенат*, які ўключаў два дэпартаменты — цывільны і крымінальны. З канца XIX ст. Сенат займаўся абнародаваннем і тлумачэннем законаў, мог выдаваць адміністрацыйныя распараджэнні.

# СПЕЦЫФІКА ПРАВЯДЗЕННЯ РЭФОРМЫ НА БЕЛАРУСІ

**сувязь судовай рэформы з палітыкай царызму, накіраванай на падаўленне нацыянальна-вызваленчага руху.** ***Па палітычных прычынах судовая рэформа на Беларусі пачалася, па сутнасці, толькі ў 1872 г., калі былі ўведзены міравыя суды, а акруговыя суды з інстытутамі прысяжных засядацеляў былі ўтвораны ў заходніх губернях аж у 1882 г.***

увядзенне судовых статутаў па частках

адкрыццё мясцовых і агульных судоў у розны час.

# ІНШЫЯ РЭФОРМЫ

| | |
|---|---|
| ***Земская рэформа 1864 г.*** | **Паводле яе ў губернях і паветах стваралася сістэма органаў мясцовага самакіравання – губернскія і павятовыя земствы з прадстаўнікоў розных саслоўяў, якія займаліся пытаннямі мясцовай гаспадаркі, аховы здароўя, народнай адукацыі і г.д. На тэрыторыі Беларусі дадзеная рэформа не была праведзена да 1911 г.** |
| *Гарадская рэформа 1870 г.* | у гарадах ствараліся ўсесаслоўныя органы грамадскага самакіравання – *гарадскія думы* і *гарадскія ўправы*. Выбары праходзілі на аснове *маёмаснага цэнзу*. |
| *Ваенная рэформа 1874 г* | адмянялася сістэма рэкруцкіх набораў. Была ўведзена *абавязковая вайсковая павіннасць* для ўсіх асоб мужчынскага полу, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Уводзіўся скарочаны тэрмін службы: для сухапутных войскаў – 6 гадоў службы і 9 гадоў запасу, для флоту 7 гадоў службы і 3 гады запасу |
| *Адукацый ная рэформа 1864 г.* | Адукацыйная сістэма набывала ўсесаслоўны характар. Асновай сярэдняй адукацыі станавіліся гімназіі, якія дзейнічалі на платнай аснове. У сістэме пачатковай адукацыі грамадскім арганізацыям і прыватным асобам дазвалялася па ўзгадненні з уладамі адкрываць народныя 4-класныя вучылішчы. |

# КОНТРРЭФОРМЫ:

| | |
|---|---|
| ***Судовыя контррэформ ы 1887-1889 гг.*** | **Быў зменены цэнз для выбрання прысяжных засядацеляў у судзе з мэтай павелічэння колькасці прадстаўнікоў ад дваран. Заканадаўча замацоўваліся канфіскацыя шэрагу судовых спраў (асабліва тых, якія датычылі супраціўлення ўладам) з вядзення суда прысяжных і абмежаванне публічнасці судоў.** |
| *Закон аб земскіх начальніках 1889 г.* | Скасоўваўся інстытут міравых судоў. Замест іх судовая ўлада ў паветах у адносінах да сялянства ажыццяўлялася *земскімі начальнікамі*, якія прызначаліся з ліку мясцовага дваранства. |
| *“Цыркуляр аб кухарчыных дзецях” 1887 г.* | Паводле яго, аднаўляліся элементы саслоўнасці ў сярэдняй школе. Забараняўся прыём у гімназіі дзяцей асобных катэгорый насельніцтва: фурманаў, прачак, дробных крамнікаў і г.д. |
| *Гарадская контррэформа 1892 г.* | Ніжэйшыя слаі гарадскога насельніцтва адхіляліся ад удзелу ў выбарах у органы гарадскога самакіравання; абмяжоўвалася прадстаўніцтва ў думах і управах яўрэяў. |

# МАНІФЕСТ 6 ЖНІЎНЯ 1905 Г.


МЫ, НИКОЛАЙ ВТОРЫЙ,

„НИКОЛАЙ".

- *На пачатку 20 ст. Расійская імперыя апынулася ў стане сістэмнага грамадскага крызісу, які выклікаў рэвалюцыю 1905-1907 гг. Дадзеныя падзеі вымусілі царскі ўрад дэклараваць пэўныя саступкі.*
- 6 жніўня 1905 г. цар Мікалай II падпісаў маніфест аб заснаванні Дзяржаўнай думы, праект якой быў распрацаваны міністрам унутраных спраў А.Р. Булыгіным (адсюль назва "булыгінская дума"). Дзяржаўная дума павінна была стаць прадстаўнічым органам, прызначаным для абмеркавання праектаў законаў, бюджэту і г.д. і падачы рэкамендацый, аднак яна не мела права самастойнага прыняцця законаў, што заставалася прэрагатывай імператара. Выбары ў думу былі шматступеннымі, а прадстаўніцтва розных сацыяльных слаёў непрапарцыянальнае; большая частка насельніцтва наогул была пазбаўлена выбарчых правоў. Усе рэвалюцыйныя і частка ліберальных арганізацый заклікалі да байкоту выбараў у "булыгінскую думу».



# *МАНІФЕСТ 17 КАСТРЫЧНІКА*

- Ва ўмовах нарастання рэвалюцыйнага руху цар Мікалай II падпісаў *маніфест 17 кастрычніка*, паводле якога Дзяржаўная дума надзялялася заканадаўчымі паўнамоцтвамі, пашыраўся кантынгент выбаршчыкаў, абвяшчалася ўвядзенне дэмакратычных свабод: слова, друку, сходаў, саюзаў, сумлення і г.д.



БОЖІЕЮ МИЛОСТІЮ,

МЫ, НИКОЛАЙ ВТОРЫЙ,

ИМПЕРАТОРЪ И САМОДЕРЖЕЦЪ ВСЕРОССІЙСКІЙ,

Царь Польскій, Великій Князь Финляндскій,

и прочая, и прочая, и прочая.

Объявляемъ всѣмъ НАШИМЪ вѣрнымъ подданнымъ:

НИКОЛАЙ.



# СТАЛЫПІНСКАЯ АГАРАРНАЯ РЭФОРМА



- Указ аб правядзенні рэформы быў выдадзены 9 лістапада 1906 г. Паколькі яе галоўным ініцыятарам з’яўляўся кіраўнік царскага ўрада П.А. Сталыпін, яна атрымала назву сталыпінскай.

# РЭФОРМА ЎКЛЮЧАЛА Ў СЯБЕ НАСТУПНЫЯ НАКІРУНКІ:

- \- замацаванне за сялянамі права на выхад з абшчыны і пераход зямельных надзелаў, якія імі апрацоўваліся, у прыватную ўласнасць;
- \- наданне сялянам права аб'ядноўваць надзелы, якія імі апрацоўваліся ва ўмовах цераспалосіцы, у адзіным комплексе (*водруб*), або ўвогуле высяляцца з вёскі і фарміраваць асобную сядзібу з прылеглымі да яе сельскагаспадарчымі ўгоддзямі (*хутар*);
- \- арганізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё агратэхнікі, меліярацыі, распаўсюджанне сельскагаспадарчых машын і абсталявання, падрыхтоўку аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынараў, заахвочванне развіцця сельскагаспадарчай кааперацыі;
- \- матэрыяльная падтрымка заможнага сялянства ў набыцці зямлі, сельскагаспадарчых машын, увядзенні перадавых форм гаспадарання, у першую чаргу шляхам выдачы крэдытаў праз Сялянскі пазямельны банк;
- \- арганізацыя перасялення сялян на свабодныя землі Сібіры, Цэнтральнай Азіі і Далёкага Усходу з мэтай змяншэння сялянскага малазямелля ў еўрапейскай частцы імперыі;
- \- адмена для сялян абмежаванняў на свабодны выбар пастаяннага месца жыхарства, паступленне ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

# РЭФОРМЫ Ў НАКІРУНКУ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ:

- 1) Дазвол пераходу з праваслаўя ў іншыя хрысціянскія веравызнанні, паводле закону аб верацярпімасці 1905 г. У адпаведнасці з гэтым адбываўся масавы пераход нашчадкаў былых уніятаў, гвалтоўна пераведзеных у праваслаўе, да каталіцызму.
- 2) Дазвол на адкрыццё школ з мовамі выкладання нацыянальных меншасцяў імперыі ў адпаведнасці з законам 1905 г. і скасаванне абмежаванняў на развіццё друку на мовах нацыянальных меншасцяў.

# ЗЕМСКАЯ РЭФОРМА 1911 Г.

У губернях і паветах стваралася сістэма органаў мясцовага самакіравання – земствы. Земствы ўяўлялі з сябе выбарныя мясцовым насельніцтвам прадстаўнічыя органы – губернскія і павятовыя земскія сходы, якія прызначалі пастаянна дзеючыя выканаўчыя органы – земскія ўправы. У функцыі земстваў уваходзіла развіццё мясцовай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, шляхоў зносін, культуры, адукацыі, аховы здароўя за кошт сродкаў, сабраных са спецыяльных мясцовых (земскіх) падаткаў. У той жа час земскія ўстановы знаходзіліся пад кантролем губернатара і міністра ўнутраных спраў, якія маглі прыпыніць выкананне любой пастановы земскіх установаў. Выбары ў земствы былі шматступеньчатымі і няроўнымі, дзейнічаў маёмасны цэнз. У адрозненне ад расійскіх губерняў, дзе выбаршчыкі падзяляліся на саслоўныя курыі, у беларускіх губернях выбары ажыццяўляліся па нацыянальных курыях – “рускай” і “польскай”; пры гэтым маёмасны цэнз для выбаршчыкаў “рускай” курыі быў удвая ніжэйшы, што забяспечвала ім перавагу. У той жа час у Віленскай і Гродзенскай губернях земствы так і не былі ўведзены з-за перавагі католікаў ў структуры насельніцтва. Нягледзячы на недэмакратычны характар выбараў і абмежаваныя магчымасці, земствы адыгралі ў цэлым прыкметную ролю ў развіцці мясцовай эканомікі, адукацыі і аховы здароўя.